ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2019 года.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
22 ЛІСТАПАДА 2018 г. ЧАЦВЕР № 225 (28841)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ЛАПКО, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«У многіх краінах свету існуе механізм абароны банкаўскіх укладаў — сістэма гарантавання ўкладаў, сутнасць якой заключаецца ў тым, што ў выпадку адклікання ліцэнзіі ў банка або яго банкруцтва адказнасць за выплату грашовых сродкаў укладчыкам бярэ на сябе спецыяльна створаная арганізацыя. У Беларусі гэтая сістэма дзейнічае з 1995 года. Сістэма не павінна быць статычнай. Мы за эвалюцыйнае развіццё, вывучэнне і затым прынясце рашэння аб тым, што нам рабіць далей, што мяняць. Сістэма павінна эвалюцыяніраваць з улікам шматлікіх фактараў. Калі і будзем прымаць нейкае рашэнне, калі сума кампенсацыі будзе перагледжана, будзем арыентавацца на тое, каб мы пакрывалі па фізічных асобах практычна 100 %, бо ў нас сацыяльна арыентаваная дзяржава».*

# Вялікая кніга Гісторыі




Фота Андрэя САЗОНАВА.

Нядаўна пабачыў свет 4-ы, заключны, том «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі». Гэта ўнікальнае выданне, у якім упершыню сабраны навукова-даведачныя картаграфічныя творы, якія адлюстроўваюць гістарычнае мінулае нашай дзяржавы. Такім чынам мы атрымалі поўнае, навукова дакладнае ўяўленне пра гісторыю Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці.

Учора «Вялікі атлас» урачыста прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі з удзелам стваральнікаў выдання, дзеячаў культуры і навукі, прадстаўнікоў дыпламатычных місій. Дзякуючы ўяўнай экскурсіі па старонках чатырох тамоў прысутныя змаглі прасачыць гісторыю Беларусі ад каменнага веку да XXI стагоддзя.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

## КОРАТКА

• **Урад падрыхтаваў праект пастановы аб павышэнні мінімальнай зарплаты.**

• У Гродзенскай вобласці самым папулярным відам дзейнасці сярод самазанятых застаецца рэпетытарства, на цяперашні момант зарэгістравана больш за 750 чалавек.

• **Фрагменты легендарнага танка Т-34-76 раскапалі ў пасёлку Залаты Рог Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.**

• Беларуска Марыя Васілевіч увайшла ў топ-30 на конкурсе «Топ-мадэль свету» ў рамках конкурсу «Міс свету — 2018».



ISSN 1990 - 763X

Далёкае-блізкае

## ДРАЎЛЯНАЯ, КАМЕРНАЯ, УНІКАЛЬНАЯ

Беларуская царква ў Лондане намінавана на найвышэйшую архітэктурную ўзнагароду Еўропы

**Беларуская царква, пабудаваная ў Лондане па замове беларускай дыяспары архітэктарам Цзыўаем Со, ужо атрымала шматлікія ўзнагароды ў архітэктурных конкурсах. Спаборнічаючы з будынкамі, створанымі найлепшымі архітэктурнымі школамі свету, яна неаднаразова абыходзіла іх і прызнавалася пераможцай. Камернасць, архітэктурная вытанчанасць і ўзнёсласць да неба сумяшчаюцца ў ёй з пэўнай утульнасцю і нават дамашняй атмасферай. Цяпер царква зноў намінавана — на званне найлепшага будынка ў Еўропе! Карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з яе стваральнікам — архітэктарам Цзыўаем Со і распытала пра крыніцы натхнення і пра нюансы будаўніцтва беларускай царквы ў Лондане.**

СТАР. 13



Фота Якіма БОРАНА.

50+: жыць цікава!

## СМАРТФОН — НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЎНУКАЎ

Пажылыя беларусы асвойваюць мабільныя тэхналогіі

**Яшчэ зусім нядаўна многія нашы пенсіянеры марылі знайсці агульную мову з персанальным камп'ютарам, а планшэты і смартфоны лічыліся атрыбутам моладзі. Час ідзе, і сёння гэтыя разумныя прылады становяцца ўсё больш папулярнымі і сярод людзей залатога ўзросту. Яны вельмі зручныя — гэта сапраўдныя міні-камп'ютары ў кішэні. З іх дапамогай можна не толькі патэлефанаваць сваякам, але і ў любы час і ў любым месцы заходзіць у інтэрнэт і чытаць навіны, аплачваць камунальныя паслугі, а калі ўсталяваць на смартфон спецыяльныя праграмы для кантролю здароўя, то цаны такому мабільнаму памочніку не будзе.**

СТАР. 4